# ФОТА-КОНКУРС '90

Напэўна, няварта пераконваць чытача ў мэтазгоднасці з'яўлення на старонках газеты прывабнай фотаілюстрацыі. Таму што менавіта фатаграфія, асабліва мастацкая, надае кожнаму выданню сваю прыгажосць і непаўторнасць, робіць ягоны «твар» гарманічным па форме і зместу.

Летась «Чырвонка» праводзіла фотаконкурс з мэтай выяўлення і пошуку найбольш цікавых майстроў мастацкай і рэпарцёрскай здымкі. Дарэчы, правядзенне конкурсаў стала ўжо традыцыйным у нашай газеце і па водгуках чытачоў заслугоўвае ўвагі надалей.

Сярод актыўных аўтараў, удзельнікаў мінулагодняга фотаконкурса, рэдакцыйнае журы прызнала пераможцамі шэраг фатографаў. Першыя тры месцы занялі Ігар БЫШНЁЎ, Павел ЦІШКОЎСКІ і Анатоль КЛЯШЧУК. Яны будуць у нагароджаны прэміямі і ганаровымі граматамі «Чырвона змены». Заахвочвальныя прэміі і ганаровыя граматы атры маюць таксама фатографы Якаў МЯЦЕЛІЦА, Сяргей ГРЫ Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ і Уладзімір ВАЙЦЯХОЎСКІ. Віншуе пераможцаў! А тым, хто не паспеў своечасова даслаць св работы ў газету, альбо крышачку пакуль не «дацягнуў» д пэўнага ўзроўню майстэрства — нагадваем, што рэдакц абвяшчае новы фотаконкурс, які мы мяркуем правесці п эгідай юбілею «Чырвонкі» — сямідзесяцігоддзя.

Чакаем ад вас, шаноўныя чытачы, цікавых здымкаў, вы кананых у самых розных тэхніках і ў самых розных жа рах. Жадаем поспехаў. Сённяшняя фотападборка — перш ластаўка новага конкурсу.











Фотаздымкі С. БРУШКО, С. ГАСПАДУРЫ, У. КАГУЦЕНКІ і У. ВАЙЦЯХОЎСКАГА

# XX СТАГОДДЗЕ



Жыхары Сафіі часта заглядваюць у невялікі мастацкі салон, арганізаваны маладымі мастакамі—выпускнікамі Балгарскай акадэміі мастацтваў Марыянай Стойчавай і Георгіем Крачунавым. Наведвальнікі могуць пазнаёміцца з калекцыяй посуду, вырабаў з керамікі, пано, свяцільнікаў. Купіць рэч, якая спадабалася, або зрабіць заказ. У размешчанай у глыбіні салона майстэрні прама на вачах наведвальнікаў нараджаюцца новыя творы.

**НА ЗДЫМКУ: МАРЫЯНА і ГЕОРГІЙ за работай.**

Фота БТА.

# Навіны суседняй Польшчы

## ПОЙДЗЕМ ВУЧЫЦЦА Ў... ВАРШАВУ

Урад Польскай Рэспублікі мае намер праводзіць новую палітыку адносна ўсіх палякаў, якія пражываюць за рубяжом. Аб гэтым заявіў на сходзе аб'яднання «Польская абшчына» міністр замежных спраў Кшыштаф Скубішэўскі. Ён падкрэсліў, што будуць вырашаны пытанні двайнога грамадзянства і эміграцыі з мэтай заработку, будзе навярстана таксама ўпушчанае ў кантактах з палякамі ў Савецкім Саюзе.

Нагадаем, што аб'яднанне «Новая абшчына» створана ў гэтым годзе замест таварыства па сувязях з землякамі за мяжой «Палонія», якое праіснавала 35 гадоў.

У інтэрв'ю тэлебачанню маршал сената Анджэй Стэльмахоўскі, які з'яўляецца адначасова старшынёй «Польскай абшчыны», дадаў, што «як краіна, мы ў велізарным даўгу перад больш чым 2-мільённай савецкай Палоніяй».

У напрамку гэтай новай палітыкі зменены планы навучання замежных студэнтаў у польскіх вышэйшых навучальных установах. Агульная колькасць месц для замежных грамадзян на першых курсах дзённых аддзяленняў у параўнанні з мінулым годам скарочана на адну трэць. Такім чынам, вызваліліся месцы для юнакоў і дзяўчат польскага паходжання, якія пражываюць на тэрыторыі Савецкага Саюза.

Яны будуць запрошаны таксама на двухгадовыя педагагічныя курсы, на семінары для настаўніцкіх кадраў. Частка савецкай моладзі польскай нацыянальнасці зможа паступіць у прафесіянальныя вучылішчы за Бугам.

## ЧАСОПІС ПОЛЬСКІХ БЕЛАРУСАЎ

Ён выдаецца ў Беластоку ўжо 34 гады. Прызначана «Ніва» для беларускай абшчыны ў Польшчы.

— Наш часопіс выходзіць тыражом 5 тысяч экземпляраў, — гаворыць галоўны рэдактар Віталь Луба.—Распаўсюджваецца галоўным чынам у Савецкім Саюзе, крыху — у Злучаных Штатах, Канадзе, Паўднёвай Амерыцы, Германіі. Мы стараемся пісаць аб палітыцы, гісторыі, падзеях культурнага жыцця — аб усім, што цікавіць нашых чытачоў. У тым ліку і маленькіх. Штотыднёва друкуем «Зорку» — дзве старонкі для дзяцей, па якіх малышы могуць вывучаць беларускую мову. Раз у месяц у часопісе можна знайсці «Белавежу» — літаратурную старонку, якая выходзіць пад апякунствам Беларускага літаратурнага таварыства. Гэтак жа раз у месяц прысвячаем старонку жыццю студэнцкай моладзі, у тым ліку дзейнасці Беларускага таварыства студэнтаў у Варшаве.

Рэдактар В. Луба не сказаў, што часопіс стаў важным цэнтрам беларускага інтэлектуальнага жыцця ў Польшчы.

## «ГАВОРЫЦЬ БЕЛАСТОК»

Беларусы, якія жывуць у Беластоцкім ваяводстве, даўно хадайнічалі аб расшырэнні часу радыёвяшчання на беларускай мове. Да гэтага часу ў іх быў паўгадзінны «Беларускі культурны часопіс», трансліруемы мясцовай радыёстанцыяй па нядзелях. Цяпер рэдакцыя радыё арганізавала новую, 15-мінутную інфармацыйную перадачу, у якой расказваецца аб самых важных падзеях у жыцці рэгіёна.

## У ШКОЛАХ ПЕРАМЕНЫ ДА ЛЕПШАГА

Яшчэ ўчора нацыянальныя меншасці, якія пражываюць у Польшчы, роднай мове вучыліся толькі ў школах для меншасцей з няпольскай мовай навучання. Такую магчымасць мелі беларусы, літоўцы, украінцы і славакі.

Міністэрства народнай адукацыі выдала новае распараджэнне. Кожная нацыянальная меншасць можа вучыць родную мову як дадатковы прадмет і ў школах, дзе выкладанне вядзецца на польскай. Можна таксама выкладаць на роднай мове і іншыя прадметы. Час для гэтага адводзіцца значны.

Цяпер беларуская мова выкладаецца на тэрыторыі Польшчы галоўным чынам у Беластоцкім ваяводстве — у 45 пачатковых школах, дзе вучыцца звыш 3200 вучняў, а таксама ў дзвюх агульнаадукацыйных школах: у Гайнаўцы і Бельск-Падляскім.

Школы гэтыя маюць нямала цяжкасцей. Галоўным чынам адбіваецца адсутнасць памяшканняў і настаўнікаў. Так, напрыклад, у школах, дзе выкладаецца беларуская мова, у мінулым годзе толькі крыху больш за 30 працэнтаў выкладчыкаў мелі вышэйшую адукацыю па беларускай філалогіі. Астатнія закончылі настаўніцкія курсы або педагагічны ліцэй. Патрэбны таксама падручнікі і школьныя дапаможнікі.

## ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

Споўнілася гадавіна падпісання пагадненняў за «круглым сталом». Яны паклалі пачатак фундаментальным пераменам. «Круглы стол» — дасягненне ўсіх палякаў і доказ таго, што можна прыйсці да згоды нават тады, калі існуюць прынцыповыя супярэчнасці ў інтарэсах, імкненнях і ідэйных пазіцыях.

Падведзены і вынікі першых трох месяцаў эканамічнай рэформы. Яе аўтар, віцэ-прэм'ер Лешэк Бальцаровіч на пасяджэнні сейма адзначыў, што вялікім дасягненнем з'яўляецца затармажэнне росту інфляцыі, паляпшэнне забеспячэння рынку, забеспячэнне ўстойлівага курсу злотага ў адносінах да долара і ліквідацыя адміністрацыйнага камандавання эканомікай. «Мінусамі» рэформы сталі зніжэнне ўзроўню даходаў насельніцтва, узнікненне беспрацоўя (налічваецца ўжо 266 тыс. беспрацоўных) і зніжэнне ўзроўню вытворчасці.

## ХТО СЁННЯ ПАПУЛЯРНЫ!

Вынікі праведзеных у сакавіку апытанняў грамадскай думкі (у параўнанні са студзеньскімі анкетамі) сведчаць аб зніжэнні давер'я да грамадскіх устаноў і арганізацый. «Салідарнасць» у параўнанні са студзенем страціла 15 працэнтных балаў (аб сваім давер'і заяўляюць 60 прац. апытаных). Урад страціў давер'е 11 прац. рэспандэнтаў. Каціроўка сената ўпала на 9 балаў, да ўзроўню 66 прац., а сейма на 10 балаў — таксама карыстаецца давер'ем 66 прац. апытаных.

Аслабла давер'е да польскай сялянскай партыі «Адраджэнне» (з 33 прац. да 25 прац. у сакавіку) і дэмакратычнай партыі (з 32 прац. да 24 прац.). 13 прац. рэспандэнтаў заявілі аб сваім давер'і да сацыял-дэмакратыі Польскай Рэспублікі. У студзені яе папярэдніца ПАРП, літаральна за дзень да ліквідацыі, карысталася давер'ем усяго 6 прац. апытаных.

(ПАП — для БЕЛТА).

## калейдаскоп

Незвычайны эфект зрабіла ў лёсе вядомага амерыканскага кінаакцёра Даніэля Дэй-Люіса роля ірландскага пісьменніка і мастака Крысці Брауна ў стужцы «Май лефт фут» («Мая левая нага»), пакуты і жыццёвыя нягоды якога звязаны з цяжкай фізічнай хваробай.

«Я так парадніўся з вобразам Брауна, — гаворыць акцёр, — што літаральна адчуў яго боль. — Не магу сказаць, што я чэрствы чалавек, але да пакут навакольных быў даволі халодны і няўважлівы. Адчуўшы трагедыю Брауна, я зразумеў, што не магу заставацца ў баку ад лёсаў калек, інвалідаў і іншых няшчасных». Рэалізуючы свае гуманістычныя намеры, Дэй-Люіс стаў актывістам амерыканскага руху міласэрнасці.

**НА ЗДЫМКУ:** Даніэль Дэй-Люіс, які прыбыў у Вашынгтон, каб прыняць удзел у маніфестацыі грамадскасці ў абарону правоў інвалідаў.



Вядомы швейцарскі дызайнер верхняга адзення Луіджы Калані завяршыў нядаўна работу над калекцыяй верхняга адзення, прызначанага для абслуговага персаналу нацыянальнай авіякампаніі «Суісэйр». Усяго створана некалькі варыянтаў формы для пілотаў, штурманаў, сцюардэс і авіятэхнікаў. На выраб 9 тысяч камплектаў формы Калані спатрэбілася 250 кіламетраў цёмна-сіняй паўшарсцяной тканіны, якая каштавала кампаніі 16 мільёнаў швейцарскіх франкаў. Акрамя афіцыйнай формы для работнікаў «Суісэйр», дызайнерам былі прапанаваны таксама варыянты «дамашняга» адзення.

**НА ЗДЫМКУ:** работнікі «Суісэйр» дэманструюць сваю новую рабочую форму.



ГДР. У Лейпцыгу знаходзіцца навучальная ўстанова для глуханямых. Усім, хто скончыў школу, гарантуецца месца вучня на вытворчасці. Яны могуць выбраць сабе любую з 14 рабочых прафесій або прадоўжыць адукацыю ў спецвучылішчы.

У 1988 годзе ў рэспубліцы распрацавана адзіная праграма арганізацыі курсаў для тых, хто мае патрэбу ў навучанні мовы жэстаў. Іх праводзяць, у прыватнасці, народныя універсітэты.

**НА ЗДЫМКУ:** урок фізікі ў 10-м класе.



